№ 11 Менск, кастрычнік 1990 Кошт 30 кап.

# СВАБОДА

## БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Выдаецца на беларускай мове Янкі Купалы, Максіма Гарэцкага, Антона Луцкевіча без уліку пастановы СНК БССР ад 1933 году.
Дасланыя матэрыялы рэдакцыя не рэцэнзуе і не вяртае.
Думка аўтараў не абавязкова супадае зь меркаваньнем рэдакцыі.

Адрас для карэспандэнцыі й паштовага пераказу грошай на падпіску: 220045, Менск, п/с 17, сп. Сабаленку Алесю Міхалавічу. Умовы падпіскі зьмешчаныя на стар. 6.
Выпускаецца штотыднёва (затрымкі — вымушаныя) з 1990 г.

## ТРЫ ЗАЎТРА БЕЛАРУСІ:

1. **Новы саюзны дагавор** (15+1: рэспублікі плюс цэнтар). Беларусь працягвае быць аб'ектам чужых інтарэсаў, падпарадкаваная «моцнаму цэнтру», з сваім марыянеткавым урадам.

Абраўшы гэтае заўтра, мы абіраем жорсткую дыктатуру КПСС, якая праз надзвычайнае становішча захавае сваю ўладу і ўедзе ў рынкавую эканоміку на пакутах і зганяньні народа.

2. **Вялікая, малая, белая** («Российский союз», прапанаваны А. Салжаніцыным). Беларусь вяртаецца на 100 гадоў назад, каб зноў стаць безгалосай ускраінай абноўленае моцнае Расейскае імпэрыі. Пэрспэктыва: страта ўсялякай адметнасьці (мы зноў — Северо-Западный край), пакуты і зганеньне народа.

На карце новай Вялікай Расеі ўсю Беларусь накрые адзін маленькі знак — знак радыяцыі.

3. **Балтыйска-Чарнаморскі саюз** (прапанова БНФ).

Пяць рэспублікаў — Эстонія, Латвія, Літва, Беларусь і Украіна — ствараюць свой агульны рынак на ўмовах поўнае роўнасьці, каб разам інтэгравацца ў сусьветную экономіку. Мост праз усю Эўропу на шляху транскантынентальных транзітаў стане гарантыяй ад любых блякадаў і заручкай роскваіту. Такі саюз — моцны геапалітычны фактар паміж абноўленай Нямеччынай і абноўленай Расеяй.

У гісторыі падобны саюз існаваў амаль 5 стагодзьдзяў. І гэта быў залаты век для Беларусі.



### *Разьвітаньне зь Леніным*

Існуе думка, што Леніна чакае свой XX зьезд. Але хто яго будзе праводзіць?

Сталін хаваўся за помнікі Леніну. Помнікі Сталіну былі ўжо ненадзейнаю абаронаю і хутка пайшлі на пераплаўку. За каго ж схаваюцца верныя ленінцы, калі не застанецца бронзавага Ільліча? За «валюнтарыста» Хрушчова? За абчаплянага ардэнамі з галавы да пятаў Ільліча № 2? За гэбіста тав. Андропава? За тав. Чарненку, за якога ня здолелі схавацца (памятаеце ТАССаўскае фота?) нават тыя, хто перастаўляў генсеку ногі, калі той прыйшоў на выбарчы ўчастак галасаваць за самога сябе?

У наступным нумары беларускае газэты СВАБОДА чытайце цалкам эсэ Уладзімера Арлова «Разьвітаньне зь Леніным».

## Беларусі патрэбны геній

**СУЧАСНЫЯ НАТАТКІ**

Прызнаючы вяршэнства агульначалавечых каштоўнасьцяў над клясавымі, усё больш людзей пачынае адмаўляць насільле як фактар грамадзкага прагрэсу. Падобна, у гэтым галоўная асаблівасьць нашага часу. Але частка людзей успудзілася: якую тады афарбоўку набудзе гісторыя Расеі, той Расеі, якая вайной, прымусам далучала да сябе народы? Гора, дый годзе. Глядзіш, беларусы кінуць услаўляць карную місію Суворава, а потым і наогул стануць напаўняць рэальным зьместам Дэклярацыю аб сувэрэнітэце.

Сацыялістычная ідэя не перамагла імпэрскую. Гэтак і новае мысьленьне альбо пройдзе, альбо ня пройдзе праверку імпэрскай ідэяй. Ужо сёньня цяжка разважаць пра вяр-

(Далей глядзі стар. 4).

**ФІРМА БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ «БІАПОЛ». ГЛЯДЗІ СТАР. 3**

BIAPOL

B I A P O L

PRZEDSIĘBIORSTWO PRODUKCYJNO – HANDLOWO – USŁUGOWE Sp. z o.o.

02-516 WARSZAWA ul. Starościńska 1B. Tel. 48(22) 483061

ных стратаў, якія мы панесьлі з-за блякады Літвы. Удзельнікі лінейкі выказалі недавер старшыні райсавету Н. Н. Лапцеву. У знак пратэсту супраць дрэннага вырашэньня чарнобыльскае праблемы ўдзельнікі лінейкі пастанавілі не пускаць дзяцей у школу на працягу першага тыдня навучальнага году.

## С. Хмара — Б. Ельцыну

**Прэзыдэнт Камітэту Вольнае Беларусі С. Хмара накіраваў Б. Ельцыну Зварот**, у якім адзначыў: «у межах Вашае Рэспублікі знаходзяцца беларускія этнічныя гістарычныя землі, разам са старой сталіцай стараветнага Беларускага Княства — Смаленскам, стаўшым на кароткі час першай сталіцай Беларускай Савецкай Рэспублікі 1920 году, як і часткай абвешчанай у 1918 годзе Беларускай Народнай Рэспублікі». Сёньня, — кажа С. Хмара, — калі Расейская Рэспубліка абвясьціла свой сувэрэнітэт, першым слушным крокам будзе:

«1. Увядзеньне ў школах, у грамадзкіх і ўрадавых установах беларускай мовы побач з расейскай.

2. Утварэньне са Смаленскай, Бранскай і заходняй часткі Пскоўскай вобласьцяў адной асобнай адміністрацыйнай і эканамічнай адзінкі — Усходне Беларускага Краю ці Смаленскага Краю з сваім асобным выбарным краёвым органам.

Прызнаньне ўсім аўтахтонным жыхарам Усходняе Беларусі іхняга нацыянальнага беларускага імя з аўтаматычным упісаньнем імя «беларус» у дзейныя дакументы...»

## 7 лістапада — насустрач танкам

БНФ распаўсюдзіў улётку з заклікам да менчукоў 7 лістапада а 10.00 сабрацца на плошчы імя Якуба Коласа. Мы ня хочам браць удзел у піры ў часе чумы, — гаворыцца ва ўлётцы. — Камуністы бразгатам зброі будуць сьвяткаваць чарговую гадавіну свайго захопу ўлады. Выйдзем на вуліцы, каб засьведчыць канец камунізму.

## Антон Луцкевіч у «Нёмане»

**У ліпеньскім нумары часопіса «Нёман»** надрукаваныя разьдзелы з кнігі гісторыка і публіцыста, сталага аўтара СВАБОДЫ Анатоля Сідарэвіча «Антон Луцкевіч». Гэта па-сутнасьці першая сапраўдная палітычная гісторыя Беларусі XX стагодзьдзя — пра тое, якія і як ствараліся, існавалі і зьнікалі на Беларусі дзяржаўныя ўтварэньні, палітычныя партыі, выданьні і суполкі новага часу, што такое БНР і што такое БССР, што такое БСГ і КПБ. З кнігі Сідарэвіча бяз шламу бальшавіцкае ідэалёгіі даведваемся пра лёс і асобы выдатных дзеячоў Беларусі, якія ў большасьці былі рэпрэсаваныя і абылганыя так званымі «савецкімі гісторыкамі».

## У 13.00 пачнецца футбол

**Пра гэта даведаліся сябры Хойніцкае групы падтрымкі БНФ** перад мітынгам, які быў дазволены ім на мясцовым стадыёне з 12.00 да 16.00. Мітынг адбыўся побач са стадыёнам. Утвораны страйкавы камітэт. (Паводле Алеся Яўсеянкі).

## «Белая Россия» на Беларусі

**У Менску распаўсюджаная ўлётка «народно-православного союза «Белая Россия»**. Улётка скіраваная супраць Дэклярацыі пра сувэрэнітэт Беларусі.

(Далей глядзі стар. 6).

## Да візыту К. Скубішэўскага

Каля польскага генконсульства ў Менску 15 кастрычніка міністра замежных справаў Польшчы К. Скубішэўскага сустрэў пікет БНФ з лёзунгамі ў падтрымку беларусаў Беласточчыны.

**Памёр Міхал Дубянецкі. Ён адзін быў варты многіх у сёньняшнім беларускім Адраджэньні. Ягоным жыцьцём, як нічым іншым, акупленая праўда пра Беларусь у БССР. Вечная памяць!**

**СВАБОДА.**



## *Фірма беларусаў у Польшчы*

**«Біапол» можа даставіць Вам на выгодных умовах наступныя тавары, прадукаваныя ў славутых сусьветных фірмах:**

**— кампутары, пэрыфэрыйныя й дадатковыя ўстаноўкі;**

**— магнітавіды й здымальнікі відэа;**

**— тэлефонныя апараты, тэлефаксавыя ўстаноўкі і ксэраграфы;**

**— касэты відэа й аўдыа;**

**— аднаразовыя мэдыцынскія шпрыцы;**

**— хірургічныя рукавіцы, скальпелі, прэзэрватывы і г. д.**

**— установкі для апрацоўкі драўніны;**

**— машыны ды ўстаноўкі для абсталяваньня кухняў у рэстаранах;**

**— розныя іншыя тавары шырокага выкарыстаньня.**

**У першую чаргу фірма «Біяпол» рэалізуе заказы вялікіх колькасьцяў тавару оптам. Аплата ў валюце альбо ў рублях 5 катэгорыі (трансфэрныя — сымболь 899).**

**Фірма зацікаленая ў пакупцы розных тавараў на Беларусі.**

**Запытаньні ды прапановы кіруйце на адрас, што зьмешчаны на першай старонцы ў гэтым нумары газэты СВАБОДА.**

**Кіраўнік фірмы Аўген Салагуба.**


# Сэсія Сойму БНФ

(Працяг са стар. 2).

ры і заключэньне прамых пагадненьняў зь іншымі дзяржавамі, найперш з былымі савецкімі рэспублікамі.

Сойм прапануе суполкам, Радам БНФ, дэпутатам ад БНФ:

— ствараць апазіцыйныя фракцыі БНФ і надалей ня браць на сябе адказнасьці за антынародныя рашэньні саветаў...

— згуртавацца са страйкавымі камітэтамі, спрыяць іхняй каардынацыі, вылучэньню палітычных патрабаваньняў;

— каардынаваць дзейнасьць з усімі палітычнымі сіламі, якія стаяць на груньце незалежнасьці і дэкамунізацыі Беларусі;

— распачаць стварэньне сеткі грамадзянскіх камітэтаў для рэгістрацыі грамадзянаў Беларускай Рэспублікі — выбаршчыкаў будучага Усебеларускага Устаноўчага Сойму;

— утвараць вайсковыя камісіі пры радах БНФ, неадкладна распачаць кампанію пратэсту супраць пераводу савецкага войска з Усходняй Эўропы на Беларусь, супраць савецкіх ядзерных базаў на Беларусі, прызыву беларускіх юнакоў на службу ў імпэрскую армію; патрабаваць альтэрнатыўнай службы на будаўніцтве жыльля для чарнобыльскіх перасяленцаў і ў войску беларускага МУС, стварэньня беларускага прафэсыйнага войска;

— разгарнуць асьветную працу праз лекторыі, лятучыя унівэрсітэты, сэмінары па пытаньнях эканомікі, палітыкі, нацыянальнай гісторыі ды культуры;

— узяць пад кантроль выкананьне мясцовымі ўладамі Закону аб мовах;

— байкатаваць падпіску на пэрыёдыку КПСС, падтрымаць падпіскай «Навіны», «Свабоду», «ЛіМ», «Наша слова», непартыйныя беларускамоўныя выданьні.»

Таксама Сойм прыняў ухвалу пра палітычную пэрспэктыву Беларусі, ухвалу з патрабаваньнем неадкладнай поўнай рэабілітацыі беларускага вязьня сумленьня Міхася КУКАБАКІ, выплаты яму кампэнсацыі за 17 гадоў зьняволеньня ў турмах і псіхіятрычных шпіталях і магчымасьці пасяліцца на Бацькаўшчыне, ухвалу аб рэлігійных дачыненьнях на Беларусі:

«Дбаючы пра адраджэньне беларускай нацыі, яе культуры й маралі, Сойм БНФ «Адраджэньне» падтрымлівае аднаўленьне ўсіх хрысьціянскіх канфэсыяў на беларускай нацыянальна - культурнай і моўнай аснове і выступае за іх самакіраваньне ды незалежнасьць ад зьнешніх палітычных сілаў».

# Акцыя СВАБОДЫ пад Воршай

**8 верасьня на полі пад Воршай сябры рэдакцыі СВАБОДЫ разам з аршанцамі ўпершыню адзначылі славутую перамогу беларускага войска над маскоўскімі захопнікамі. Першая памятка пра нашых продкаў, абаронцаў роднае зямлі— шасьцікаанцовы крыж пры дарозе па-над зьмялелаю рачулкай Крапіўнай.**

**8 верасьня. Запомніце гэты дзень.**



Гэтак памятны крыж быў дастаўлены да мейсца.
Фота А. Крыштаповіча

8 верасьня 1514 году недалёка ад Воршы адбылася адна з самых славутых бітваў паміж Старабеларускай дзяржавай (Вялікім княствам Літоўскім) і дзяржавай Маскоўскай.

Увабраўшыся ў сілу, Маскоўская дзяржава вяла тады ўжо чацьвертую вайну за так званыя «искони русские земли» — тэрыторыі Беларусі ды іншых народаў Вялікага княства. Масква і Сьвяшчэнная Рымская імпэрыя ўтварылі ваенную кааліцыю. Саюзьнікі дамовіліся, што ў выніку посьпеху агрэсіі Масковія забярэ сабе землі Беларусі ды Украіны, а Імпэрыя— тэрыторыю Польшчы. І калі ўлетку 1514 году вялізнае маскоўскае войска захапіла Смаленск, Старабеларуская дзяржава апынулася ў пагрозьлівым становішчы. Маскоўскі князь Васіль III ужо загадваў сваім ваяводам «прыгнаць да Масквы як быдла пугамі» нешматлікае беларуска-летувіскае войска і ўжо пасылаў гэтых ваяводаў далей на Беларусь.

Толькі на Бярэзіне спаткалі чужынцаў вoі Вялікага княства, якія сьпяшаліся на абарону краіны. Галоўная бітва адбылася пад Воршай, у мейсцы, дзе невялікая рачулка Крапіўна ўпадае ў Дняпро. Тут 8 верасьня 25-тысячнае войска беларускага гетмана Кастуся Астроскага было заатакаванае 80-тысячнай маскоўскай коньніцай ваяводаў Чаляднiна і Галіцы. Бітва цягнулася ад раніцы да вечару і скончылася поўнай паразай маскоўцаў.

Вестка пра перамогу пад Воршай адразу абляцела Эўропу. Кааліцыя Масквы і хаўрусьнікаў адразу развалілася. Дэмаралізаваныя маскоўскія войскі паслабілі націск на Беларусь.

Памятайма пра перамогу пад Воршай!

8 верасьня.

---

**Адам ГЛЁБУС**

# Ф. С.

Ен — Скарына — самвыдатавец.
І за гэта
Ягоны партрэт вешаюць там,
Дзе раней вісела плаката
З тварам савецкага звыш-чалавека.
Ён — Францішак — друкаваў Біблію.
Пэўна, таму
Тысячы атэістаў расфасоўваюць харчы
У бел-чырвона-чорныя пакеты,
На якіх напісана:
«500 — Францішак Скарына».
Ен — Ф. С. — пісаў на старажытна-беларускай мове.
Вядома, таму
Ягоны нашчадак гаворыць
З польска-расейскім акцэнтам
І жыве ў Канадзе.
Францішак Скарына быў лекарам.
Мусіць, за гэта
У ягоны гонар пераназвалі менскую вуліцу,
Што сьмярдзіць дэзынфэкцыяй ды бэнзынам.
Мусіць, бо
Ен — Скарына — дагледаў карапеўскі сад.

Беларусы!

Народ наш, грамадзкасць сьвету адзначаюць 500 угодкі Францішка Скарыны — славутага беларускага гуманіста, асьветніка, першадрукара.

Волат эпохі Адраджэньня, аўтар першадрукаванае беларускае Бібліі, Скарына запавядаў нам высокі ідэал чалавечнасьці — беларускасьці — усечалавечнасьці.

Сягоньня народ Беларусі працярэбліває новыя пуцявіны свайго нацыянальнага Адраджэньня: вяртае забытую, разрабаваную і скажоную таталітарнай сыстэмай спадчыну разам зь імёнамі сваіх мысьляроў і прарокаў; адраджае зьнявечанае чужынцамі і дамарослымі рэнегатамі роднае мацярынскае Слова; ладзіць сваю дзяржаўную незалежнасьць і суверэннасьць; уздымае, нарэшце, перад сьветам сваю патаптаную нацыянальную годнасьць.

Скарынава сьвята супадае з уведзеньнем у жыцьцё Закона аб дзяржаўнасьці беларускае мовы. Няхай жа ў нашым Беларускім Доме паўсюдна ажыве, загамоніць спрадвечнае слова беларускае. І кожны патрыёт ды паспрыяе сьвятой усенароднай справе, да якое здавён нас паклікаў Вучыцель: «бо мяне міласьцівы Бог з гэтай мовы на сьвет пусьціў». Будзем вартыя Божае міласьці й запавету Прарока свайго.

**Управа Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне».**

13 верасьня 1990 году
ў Менску.

Арганізацыі і прыватныя асобы могуць заключыць дамову на распаўсюджваньне беларускае газэты СВАБОДА. Зьвяртайцеся, калі ласка, па тэлефонах:

БАБРУИСК — 3-22-63 (Сп. Аляксей);
БАРАНАВІЧЫ — 6-33-26 альбо 5-32-78 (Сп. Павел);
ВІЛЬНЯ — 62-07-20 ці 73-84-75 (Сп. Хведар);
ВІЦЕБСК — 4-53-22 (Сп. Валера);
ВЯЛЕЙКА — 5-56-83 ці 5-56-56 (Сп. Натальля);
ГАРОДНЯ — 44-01-27 ці 45-22-54 (Сп. Данута);
ГОМЕЛЬ — 55-79-03 (Сп. Андрусь);
МАЗЫР — 2-42-09 (Сп. Лявон);
МАЛАДЗЕЧНА—7-72-26 (Сп. Тадэвуш) пасьля 18.00;
МЕНСК — 34-42-78 (Сп. Алесь) і 24-70-59 (Сп. Вадзім);
ПОЛАЦАК — 4-47-05 (Сп. Уладзімер) з 21.00 да 23.00, апроч аўторку й чацьверу.
РЫГА — 28-85-23 ці 37-54-12 (Сп. Сяржук).

Калі Вы жадаеце зьмясьціць Вашую рэкляму на старонках беларускае газэты СВАБОДА, зьвяртайцеся, калі ласка, па тэлефоне 34-42-78 (Сп. Алесь).

Рэдакцыя беларускае газэты СВАБОДА мае й распаўсюджвае наступныя незалежныя выданьні:

**ЛІТАРАТУРА-1**
**ЛІТАРАТУРА-2**
зборнікі твораў новых беларускіх літаратараў. Кошт аднаго асобніка — 3 рублі.

**КСЭРАКС БЕЛАРУСКІ-1**
**КСЭРАКС БЕЛАРУСКІ-2**
літаратурныя зборнікі літаратараў з Наваполацку. Кошт аднаго асобніка — 2 рублі.

**ДЗЕНЬ ВОЛІ-90**
сьвяточнае выданьне да 72-й гадавіны абвяшчэньня незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі. Кошт — 30 кап.

**КУПАЛЬСКАЯ ПАШТОЎКА**
кошт — 30 кап.

Усе гэтыя выданьні можна атрымаць, даслаўшы грошы паштовым пераказам на адрас: 222690, Менская вобласьць, Стаўпецкі раён, вёска Новы Сьвержань, завулак Стаўпецкі, д. 20, Сп. Тулейку Міхасю Уладзімеравічу.

# Бліжэй да СВАБОДЫ

Мы ў рэдакцыі атрымалі шмат лістоў з пытаньнем: якой мовай вы пішаце?

Адказ не складаны. Рэч у тым, што ў прыродзе існуюць дзьве падобныя літаратурныя мовы: беларуская і беларуская савецкая.

На беларускай мове размаўлялі нашы дзяды й бабулі. І мы гаворым з нашымі дзецьмі па-беларуску. На беларускай мове пісалі і выдавалі свае творы Купала, Багдановіч, Гарэцкі, на ёй — уся наша літаратурная клясыка, на ёй дагэтуль пішуць і выдаюць газэты ды кніжкі беларусы на эміграцыі. Галоўны прынцып беларускае мовы — як гаворыцца, так і пішацца.

Беларуская савецкая мова — гэта штучнае ўтварэньне, якое ўзьнікла ў 1933 годзе па загаду СНК БССР, калі расстралялі амаль усіх, хто пісаў па-беларуску. Гэта не самастойная мова, а адпаведнік расейскай савецкай мовы, пераклад з расейскай савецкай мовы на беларускую. Гэта двойчы не самастойная мова. Ёю нельга па-людзку гаварыць зь дзецьмі, бо нельга зь дзецьмі гаварыць мовай партыйных пастановаў. Гэта мёртвая мова. Яна сапраўды чэрствая і яе справядліва называюць «исковерканным русским языком». Беларуская савецкая мова — больш савецкая, сацыяльная, чым беларуская, нацыянальная.

СВАБОДА ня можа выходзіць на мёртвай мове рабоў. Пастарайцеся зразумець нас, і тады мы разам будзем трошкі бліжэй да сапраўднае СВАБОДЫ.

# ПАДПІСКА, ПАДОБНАЯ ДА САМАГУБСТВА

**Гадоў 10 ці 15 назад знаёмы аднаго майго знаёмца напісаў апавяданьне, дзе галоўнымі героямі былі браты Капээсэсцавы. Тады гэта было сьмешна. А цяпер нехта ў нашым грамадзтве мусіць стаць капіталістам.**

**Парткамы, райкамы, гаркамы КПСС зараз ліхаманкава зарабляюць грошы і гэтак жа ліхаманкава ўкладаюць іх у вытворчасьць.**

**Няўжо гэта яны — браты Капээсэсцавы, стануць капіталістамі, гаспадарамі нашага жыцьця! Выходзіць, яны. Учарашнія агітатары за ўсеагульную роўнасьць і супраць эксплюатацыі першыя надзенуць цыліндры і пакажуць нам, што такое клясычны капіталізм на ўзор мінулага стагодзьдзя. І пакуль мы будзем марыць пра шведзкі сацыялізм, пра амэрыканскі лад жыцьця, пра грамадзтва роўных магчымасьцяў, яны вернуць нас у першую стадыю капіталізму і прымусяць успомніць чытаныя некалі ў школе творы Дзікенса, Драйзера і Джэка Лёндана.**

**Бо самы жорсткі рабаўладальнік — гэта ўчарашні раб.**

**А пакуль браты Капээсэсцавы зарабляюць грошы. І ці не галоўны іхні прыбытак — ад бальшавіцкіх газэтаў і часопісаў.**

**Падпіска. І мы, грамадзяне, якія падпісаліся на «Правду», «Звязду», «Советскую Белоруссию» і іншыя «плюралістычныя» органы — мы спрычыніліся да ўзгадаваньня вялізнага малоха, які заўтра зьвяцца «невядома адкуль» ды нас жа і зжарэ.**

**С. П.**

Газэта,
на якую варта
зьвярнуць увагу —

**НАВІНЫ**

БНФ «Адраджэньне»!

НАВІНЫ —
гэта інфармацыя
з першых вуснаў
пра справы
палітычнае апазіцыі
ў Рэспубліцы
і за межамі.

НАВІНЫ —
гэта дэмакратычны
погляд на жыцьцё,
гэта адкрытая
для палемікі
недагматычная
пазіцыя.

НАВІНЫ —
гэта пошук
беларускага шляху
да незалежнасьці
і волі.

НАВІНЫ —
гэта лёгіка
палітычнае
барацьбы
і ўвесь спэктр
эмоцый духоўнага
Адраджэньня

НАВІНЫ —
гэта вельмі
сур'ёзна
і вельмі жыва —
пра тое, што баліць
і тое, што цешыць.

Сталыя аўтары
НАВІНАЎ:
Зянон Пазьняк
і Вінцук Вячорка,
Віктар Івашкевіч
і Юры Хадыка.

Час падпіскі
неўзабаве міне.
Няхай гэта будзе
ВАШ выбар —

**НАВІНЫ**

БНФ «Адраджэньне»!

# «...Без цябе бальшавікі абыйдуцца!»

Управа БНФ распаўсюдзіла Зварот наступнага зьместу:

«ХЛОПЕЦ! Увосень цябе забіраюць у армію? Дарагі чалавеча! Вашаму сыну прыйшла павестка ў армію? — Тады гэты зварот — да вас.

Са страхам праводзяць дзяцей у Савецкую Армію. Гэтая армія душыла свабоду венгерскага, чэскага і славацкага народаў. Гэтая армія забівала сапёрнымі лапаткамі жанчын у Тбілісі. Гэтая армія дзесяць год вяла антынародную вайну ў Аўганістане. Маскве патрэбна такая армія, а Беларусі?

Беларусь аплаціла маскоўскія аванцюры крывёю тысяч сваіх палеглых сыноў. Гэтага аказалася мала, і зараз, калі ў далёкіх рэспубліках палаюць міжнацыянальныя пажары, тушыць іх зноў шлюць нашых хлопцаў.

Ва ўсіх рэспубліках пачаўся рух супраць службы ў гэтай арміі.

Маўчыць толькі Беларусь.

Маўчыць наша Бацькаўшчына, якую спаткала страшная бяда Чарнобыля. Маўчыць мірная Беларусь, цела якой утыкана савецкімі ядзернымі базамі. Маўчыць і паслухмяна шле эшалон за эшалонам — штогод дзесяткі тысяч — сваіх хлопцаў на сьмерць і калецтва ў далёкія азіяцкія рэспублікі, на зьдзекі «дзедаўшчыны» ў казармах.

Можа, досыць?

Вярхоўны Савет БССР абвясьціў Беларусь зонай нацыянальнага экалагічнага бедства. Для будаўніцтва жыльля чарнобыльскім перасяленцам не хапае рабочых рук. На Беларусі расьце злачыннасьць, мы ня можам быць спакойныя за сваіх дачок, жонак, сясьцёр і сябровак, а ў міліцыі катастрафічна не хапае людзей.

БНФ «Адраджэньне» патрабуе, каб нашыя хлопцы праходзілі службу толькі на Беларусі:

— альбо ў рэспубліканскім войску, якое створыцца на падставе прынятай ВС БССР Дэкларацыі аб суверэнітэце;

— альбо ў органах правапарадку;

— альбо замест службы адпрацоўвалі на будоўлях для чарнобыльцаў.

Усім, хто адмаўляецца ісьці служыць у Савецкую Армію, раім слаць у Вярхоўны Савет БССР, на імя дэпутата Ул. Грыбанава, тэлеграму прыблізна такога зьместу:

**Не жадаю служыць чужым інтарэсам. Хачу служыць свайму народу на роднай зямлі. Гатовы будаваць жыльлё для чарнобыльскіх перасяленцаў, служыць у міліцыі. Подпіс, адрас.**

Змагацца лягчэй гуртам. Заклікаем ствараць Камітэты салдацкіх маці і згуртаваньні прызыўнікоў. Запрашаем для парады і каардынацыі ў гарадзкія і раённыя Рады БНФ».

## *19-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі*



### Прывітаньне ад Прэзідэнта Джорджа Буша 19-й Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі
### Белы Дом 28 жніўня 1990

Я з прыемнасьцяй перадаю свае найцяплейшыя прывітаньні ўсім, хто прыбыў на 19-ю Сустрэчу Беларусаў Паўночнай Амэрыкі. Я асабліва вітаю нашых гасьцей з Савецкага Саюзу.

На працягу апошняга году, у часе якога адважныя мужчыны й жанчыны распалілі агні свабоды па цэлай Усходняй Эўропе, мы сталіся сьведкамі аднаўленага ўздыму этнічнай годнасьці і культурнай самасьведамасьці як у гэтым рэгіёне сьвету, гэтак і ў Паўночнай Амэрыцы. Злучаныя Штаты — гэта нацыя імігрантаў, і мы падзяляем моцнае адчуваньне роднасьці з народамі краёў нашага паходжаньня. Гэтак, мы з гордасьцяй перахоўваем шмат розных звычаяў і традыцыяў, зь якіх складаецца такая вялікая частка наше культурнае спадчыны.

Ушаноўваючы ўнікальную спадчыну Беларускага народу і шматлікія выпадкі ўкладу, зробленага Беларусамі ў Злучаныя Штаты й Канаду, гэтая Сустрэча таксама падкрэсьлівае наша пачуцьцё прыязьні да тых, хто жыве на вашых айчынных землях. Народ Беларусі імкнецца будаваць там, дзе камунізм будаваў, і я далучаюся да вашае ўрачыстасьці, якая адзначае ягоныя аднаўленыя спадзяваньні на будучыню.

Барбара далучаецца да маіх найлепшых пажаданьняў вам прыемнае сустрэчы. Благаславі вас Божа.

ДЖОРЖ БУШ.

## З рэзалюцыі 19-й Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў Кліўлендзе

2. Зьвярнуцца з просьбай ад імя беларускіх грамадаў у ЗША і Канадзе да Кангрэсу ЗША і Парляманту Канады, каб у Амэрыку і Канаду былі прынятыя квоты імігрантаў зь ліку жыхароў найбольш заражаных мясцовасьцяў чарнобыльскай зоны Беларусі.

3. Падтрымаць і далей дзейнасьць Беларускага Народнага Фронту, скіраваную на ратаваньне жыхарства ад Чарнобыльскай рацыяцыі, на ратаваньне беларускае нацыі ад культурнага заняпаду, да якога давяла аднапартыйная сыстэма.

4. Рабіць захады для пабудовы коштам амэрыканскіх і канадзкіх фондаў анкалягічнага шпіталя ў Беларусі, у якім лячыліся-б ахвяры чарнобыльскай радыяцыі ды ў якім працавалі-б таксама і лекары з Амэрыкі й Канады.

5. Спрыяць усімі магчымымі спосабамі эканамічным і гандлёвым сувязям паміж амэрыканскімі, канадзкімі ды іншымі заходнімі фірмамі, з аднаго боку, і прыватнымі прадпрыемствамі Беларусі, з другога.

7. Падтрымаць справу як мага больш шырокага навуковага, культурнага і турыстычнага абмену паміж Паўночнай Амэрыкай і Беларусяй, прыезду ў Злучаныя Штаты й Канаду беларускіх студэнтаў на навуку, спэцыялістаў рознага профілю, у тым ліку сельскагаспадарчага, на практыку, моладзі на азнаямленьне з жыцьцём Беларусаў Амэрыкі й Канады.

10. Мы зварачаемся з просьбай да ўладаў Беларускай ССР, каб было спынена накладаньне мыта на дазыметры, якія жыхары Рэспублікі дастаюць ад сваіх суродзічаў з-за мяжы.

Кліўленд, Агаё, ЗША

Нядзеля, 2 верасьня 1990 году.

19-Я СУСТРЭЧА БЕЛАРУСАЎ ПАЎНОЧНАЙ АМЭРЫКІ.

Нумар падрыхтавалі А. Гуркоў, С. Дубавец, П. Жук, С. Харэўскі. Ліцэнзія № 10. Фармат А5 Афс. друк. Друкарня МАЗ. Зак. 2648. Наклад 20000.